# Закаханыя ў жыццё

**Адчуць хараство ў будзённым і звыклым запрашае мастацкая галерэя «Універсітэт культуры», дзе працуе выстаўка вышываных карцін клуба «Сузор'е» Беларускага саюза жанчын.**

Клуб вышывальшчыц «Сузор'е», які аб'яднаў майстрых розных узростаў і прафесій, існуе ўжо восем гадоў. На яго рахунку — каля трыццаці выставак.

Як паведаміла кіраўнік клуба Наталля Сак, чарговая экспазіцыя — своеасаблівая творчая справаздача. Арганізатары адабралі каля 130 лепшых работ, выкананых у розных тэхніках сучаснай вышыўкі. Гэта крыж, паўкрыж, габеленавае шво, петыт-пойнт, ручная гладзь ды інш.



*Святлана Піваварчык «Мікалай Цудатворац», 2010 г.*

Выстаўка атрымалася павясенняму цёплай і пяшчотнай. Карціны, прасякнутыя светлай энергетыкай, ствараюць пазітыўны настрой, напаўняюць натхненнем. Тут шмат каларытных пейзажаў, цікавых сюжэтных кампазіцый, выразных і характэрных партрэтаў. Часта сустракаюцца прыродныя матывы, дзіцячыя і жаночыя вобразы. Асобнае месца займаюць нацюрморты з кветкамі: у зале ўстановы «распусціліся» ружы, півоні, гладыёлусы, хрызантэмы, магноліі… Моцнае ўражанне пакідаюць вышываныя іконы, а таксама выдатныя рукатворныя копіі карцін выбітных жывапісцаў.

Кожная работа — цэлы маленькі сусвет, створаны працавітымі рукамі з дапамогай звычайнай іголкі і рознакаляровых нітак. Вырабы, вытанчаныя і далікатныя, зачароўваюць ювелірнай дасканаласцю. Сюжэты, на першы погляд простыя і немудрагелістыя, заклікаюць гледача паразважаць, знайсці адметнае ў звычайных рэчах.

Адкрыццё выстаўкі супала з візітам у нашую краіну дэлегацыі Літвы, Малдовы і Швецыі ў межах міжнароднага праекта «Падарожжа за мяжу — прасоўванне сацыяльнай і эканамічнай актыўнасці жанчын у развіцці партнёрскай сеткі паміж Еўрапейскім саюзам і Усходняй Еўропай». Прадстаўнікі замежных дзяржаў адзначылі высокае майстэрства вышывальшчыц, цеплыню і шчырасць работ.



*Фота Кастуся Дробава*

*Таццяна Барадзіна «Табун», 2013 г.*

**Ганна ПАЛЯКОВА**